УДК 947.6 «1920/1930»

А. У. Дзянісаў, аспірант

# КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ У БССР У 1920 – ПАЧАТКУ 1930-Х ГГ.

The article is devoted to the problem of formation and development of the aria study movement in Belarus in 1920's–1930's years, which was one of the important trends in the national history.

Краязнаўчы рух на Беларусі ў дадзены перыяд дасягнуў свайго найвышэйшага росквіту. Гэта была адметная з'ява не толькі ў БССР, але і ва ўсесаюзным маштабе. Невыпадкова, на Другой Усесаюзнай канферэнцыі па вывучэнні прыродных і вытворчых рэсурсаў СССР, якая адбылася ў 1928 г. у Маскве, было адзначана, што па колькасці краязнаўчых арганізацый і агульнай лічбе краязнаўцаў у СССР «на першым месцы знаходзіцца Беларусь, якая займае ў гэтых адносінах выключнае становішча сярод іншых рэгіёнаў Саюза» [9, с. 21].

Гэтая ацэнка з'явілася вынікам шматгадовай плённай працы шырокага кола краязнаўчых суполак, у якія ўваходзілі вядомыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, навуковай эліты і дзяжаўныя дзеячы, такія як Д. М. Васілеўскі, З. Х. Жылуновіч, З. Бядуля, М. І. Гарэцкі, Дз. І. Даўгяла, В. Д. Друшчыц, Я. Колас, К. Крапіва, М. І. Каспяровіч, У. І. Пячэта, М. М. Улашчык, М. М. Шчакаціхін, А. А. Шлюбскі і інш. Аб пачатковым этапе краязнаўчай дзейнасці на Беларусі сведчаць першыя краязнаўчыя таварыствы, што ўзнікаюць у 1919–1920 гг. Найбольш актыўна дзейнічала, напрыклад, Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцей, якое аформілася ў 1919 г. пры Мінскім педагагічным інстытуце. У тыя ж гады ў Слуцку працавала культурна-асветніцкае таварыства «Папараць-кветка» [5, с. 15].

З 1922 г. пачынаюць актыўна фарміравацца краязнаўчыя арганізацыі пры навучальных і навуковых установах, аддзелах народнай асветы. З 1924 г. краязнаўчы рух набыў масавы характар. Як адзначаў адзін з непасрэдных удзельнікаў М. М. Улашчык: «Краязнаўчы рух рос у геаметрычнай прагрэсіі. Беларусы, нацыянальна свядомыя людзі, перасталі быць навіною, дзівам. Колькасць іх узрастала з кожным месяцам, і гэты рост павінен быў замацавацца ў нейкія арганізацыйныя формы. Быў вялізны ўздым нацыянальнай свядомасці, людзі нечым хацелі праявіць сябе, нешта рабіць не чыноўнае, не абавязковае, але тое, што робіцца "для душы"… Гэта быў уздым і размах у краязнаўчай рабоце, якога не бачыла не толькі Беларусь, але і ўвесь Савецкі Саюз» [17, с. 12]. Каардынацыйным цэнтрам краязнаўчага руху стаў Інстытут беларускай культуры, пры якім з 1923 г. была створана Камісія па рэарганізацыі краязнаўчых арганізацый. Гэтая камісія ў 1924 г. была рэарганізавана ў Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), якое ажыццяўляла метадычнае кіраўніцтва ўсім краязнаўчым рухам на Беларусі.

Сетка краязнаўчых арганізацый усё гусцей пакрывала тэрыторыю Беларусі. Узнікла неабходнасць дакладна вызначыць галоўныя задачы краязнаўчага руху і асноўныя метады работы краязнаўцаў.

У лістападзе 1924 г. адбылася Першая Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя, а 7–11 лютага 1926 г. прайшоў Першы Усебеларускі краязнаўчы з'езд. З'езд вызначыў прыярытэтныя напрамкі дзейнасці краязнаўчых арганізацый: вывучэнне дыялектаў беларускай мовы, ахова помнікаў, захаванне мясцовых архіваў, прыродазнаўчыя даследаванні, лекцыйна-экскурсійная праца. Краязнаўчыя арганізацыі павінны былі садзейнічаць уцягванню ў работу па вывучэнні свайго краю шырокіх колаў працоўнага насельніцтва, у першую чаргу рабочых і сялян, партыйных і прафсаюзных работнікаў, моладзь.

У 1927 г. канчаткова аформілася арганізацыйнае аблічча краязнаўчага руху. Нізавую краязнаўчую арганізацыю складаў гурток краязнаўства. Мэтай яго дзейнасці з'яўлялася ўсебаковае вывучэнне горада ці часткі раёна. Дзейнасць гурткоў яднался з раённым краязнаўчым таварыствам, мэтай якога было ўсебаковае вывучэнне раёна. Трэці ўзровень арганізацыі – акруговае таварыства, якое займалася даследаваннем акругі. Апрача гэтага, існавалі гурткі краязнаўства ў школах і тэхнікумах. Дзейнасць краязнаўчых арганізацый каардынавала ЦБК. Вынікі даследаванняў публікаваліся ў спецыяльным часопісе «Наш край», які стаў выдавацца ў 1925 г. і ў пачатку 1930-х гг. дасягнуў накладу 1,3 тысячы асобнікаў (з 1930 г. ужо меў назву «Савецкая краіна»), і ў іншых перыядычных выданнях. Вельмі цесна вялося супрацоўніцтва краязнаўцаў з навуковымі ўстановамі, і ў першую чаргу з археалагічнымі і этнаграфічнымі секцыямі і камісіямі Інбелкульта. Краязнаўцы прымалі актыўны ўдзел у навуковых экспедыцыях і паседжаннях Інбелкульта, працавалі самастойна па заданні гэтых устаноў.

Калі ў 1924 г. налічвалася толькі 19 краязнаўчых арганізацый, то ў 1930 г. іх лік дасягнуў 333, якія аб'ядноўвалі больш за 10 тыс. чалавек. Краязнаўцамі было сабрана каля 150 тыс. картак слоў мовы, больш за 30 тыс. узораў фальклору, каля 200 розных калекцый, быў створаны шэраг краязнаўчых музеяў. Былі арганізаваны курсы

краязнаўства пры Краязнаўчым таварыстве БДУ, на якіх займаліся больш за 200 студэнтаў. У 1930 г. краязнаўства як спецыяльная дысцыпліна была ўведзена ў праграму вышэйшых педагагічных устаноў.

Краязнаўства адыгрывала значную ролю ў музейным будаўніцтве, у ахове помнікаў гісторыі і культуры, распаўсюджванні ведаў сярод насельніцтва.

У пачатку 1930-х гг. многія вядомыя вучоныя і дзеячы краязнаўства былі рэпрэсіраваны, пачалося паступовае згортванне краязнаўчых арганізацый. У 1932 г. была прынята пастанова СНК БССР «Аб мерапрыемствах па разгортванні краязнаўчага руху», якая прадпісвала краязнаўцам даследаваць і паказваць выключна поспехі сацыялістычнага будаўніцтва. У 1933 г. па абвінавачанні ў прапагандзе ідэй нацыянал-дэмакратызму было спынена выданне часопіса «Савецкая краіна», а ў 1936 г. ліквідавана ЦБК пры АН БССР. Кіраўніцтва цалкам было перададзена Наркамату асветы БССР. 25 красавіка 1938 г. Народны камісарыят асветы СССР выдаў спецыяльную дырэктыву «Аб арганізацыі краязнаўчай працы», якой фактычна ліквідаваліся краязнаўчыя арганізацыі і гурткі, а краязнаўчай працай павінны былі займацца музеі. Згортванне дзейнасці краязнаўчых таварыстваў праходзіла па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза і было абумоўлена тым, што савецкія ўлады бачылі ў актыўным даследаванні нацыянальнай гісторыі краю антыкамуністычныя дзеянні.

Краязнаўчаму руху 1920–1930-х гг. прысвечаны шэраг прац, якія не змяшчаюць комплекснага аналізу гэтай адметнай з'явы, аднак даюць магчымасць вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці айчыннага краязнаўства ў БССР у перыяд 1920–1930-х гг. Гэта працы савецкіх, постсавецкіх і замежных гісторыкаў. Разглядаемы комплекс прац можна падзяліць на некалькі груп.

Да першай групы адносяцца працы савецкіх гісторыкаў, якія з'яўляюцца ў навуковай прэсе ў пачатку 1960-х гг. Гэта было звязана з другім этапам развіцця савецкага краязнаўства, які на Беларусі пачаўся са стварэння Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў 1965–1966 гг. Пачаткам стаў артыкул І. С. Юньева «Беседы о краеведении» [19]. Краязнаўчы рух 1920–1930-х гг. разглядаўся як станоўчая з'ява ўсесаюзнага маштабу, былі дадзены асноўныя напрамкі развіцця краязнаўчай працы вызначанага перыяду. Таксама тэме гісторыі станаўлення і развіцця савецкага краязнаўства СССР прысвяцілі свае публікацыі П. І. Кабанаў, А. У. Ушакоў, А. Г. Разгон, С. Л. Ціхвінскі [10, 12]. Краязнаўчы рух у БССР у гэтых працах узгадваўся і разглядаўся як частка працэсу развіцця гістарычнага краязнаўства, што праходзіў па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза.

Сярод прац беларускіх даследчыкаў савецкага перыяду асабліва трэба адзначыць артыкул Л. Г. Амельковіч [3]. У ім быў упершыню праведзены аналіз дзейнасці Цэнтральнага бюро краязнаўства, асноўных этапаў развіцця і станаўлення краязнаўчага руху на БССР, аднак не былі аб'ектыўна даследаваны факты, што паўплывалі на згортванне краязнаўчага руху ў 1930-х гг.

Асноўныя рысы развіцця гістарычнага краязнаўства БССР 1920–1930-х гг. былі асветлены ў комплекснай калектыўнай рабоце «Историческое краеведение Белоруссии» [9]. У асобным раздзеле прааналізаваны некаторыя напрамкі развіцця гістарычнага краязнаўства з 1920-х да канца 1970-х гг. Аднак галоўнай метаю даследчыкаў было даследаванне практычнага прымянення краязнаўства і яго педагагічны аспект.

У постсавецкі перыяд у даследчыкаў з'явіліся новыя магчымасці ў распрацоўцы тэмы развіцця гістарычнага краязнаўства на Беларусі. Сярод прац расійскіх гісторыкаў вылучаюцца працы С. Б. Філімонава, А. Н. Акіншчына. Апошні ў сваім артыкуле даследаваў змены ў палітыцы савецкіх улад да краязнаўчага руху і рэпрэсіўныя дзеянні ў дачыненні да краязнаўцаў у 1930-х гг. Гістарычнаму краязнаўству 1920–1930-х гг. прысвяцілі працы І. А. Дзмітрыева, Т. Д. Руміна [6]. У іх падаецца новы погляд на этапы развіцця краязнаўчага руху.

На Беларусі ў 1990–2000 гг. з'явіўся шэраг публікацый, якія разглядаюць некаторыя пытанні, звязаныя з краязнаўчым рухам 1920–1930-х гг., дзейнасцю краязнаўчых арганізацый. Гісторыі краязнаўчага руху прысвечаны працы Э. М. Загарульскага, А. В. Мальдзіса, А. У. Аляксеева, В. С. Вяргея [2]. А. У. Аляксееў у сваёй кнізе «Археология и краеведение в Белоруссии» праводзіць грунтоўны аналіз развіцця гістарычнага краязнаўства ў цесным узаемадзеянні з гістарычнай археалогіяй. В. С. Вяргей надае вялікую ўвагу краязнаўчым з'ездам як асноўным ключавым момантам развіцця краязнаўчага руху на Беларусі ў 1920–1930-х гг. Можна пагадзіцца з меркаваннем даследчыка аб тым, што масавы характар краязнаўчага руху, як і агульна-нацыянальны ўздым, быў выкліканы набыццём Беларусі сваёй дзяржаўнасці.

Інфармацыю аб жыцці і дзейнасці асобных краязнаўцаў можна знайсці ў працах А. Лісава, А. Падлінскага, А. Ліса, А. Каўкі. Яны разглядаюць дзейнасць краязнаўчых дзеячаў у гістарычных умовах часоў 1920–1930-х гг. Праца М. Півавара «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны. XVI ст. – 1944 г.» змяшчае вялікі пласт інфармацыі аб даследчыках беларускага краю, у тым ліку і аб дзеячах краязнаўчага руху ў БССР у 1920–1930-х гг.

Даследаваннем часопіса «Наш край» як афіцыйнага друкаванага органа Цэнтральнага бюро краязнаўства займаліся І. Раманава і І. Соркіна. Іх публікацыі змяшчаюць падрабязны аналіз краязнаўчай дзейнасці на старонках часопіса. Вялікае значэнне даследавання часопіса «Наш край» як крыніцы па вывучэнні гісторыі краязнаўчага руху 1920–1930-х гг. падкрэслівае нямецкі гісторык Р. Лінднер [11].

Зыходзячы з вышэйсказанага, можна адзначыць, што кола літаратуры, якая так ці інакш закранае тэму краязнаўчага руху ў БССР у 1920–1930-х гг., дастаткова шырокае. Трэба прызнаць, кожны з даследчыкаў звяртаў увагу на розныя бакі і этапы развіцця гістарычнага краязнаўства Беларусі, але не ставіў перад сабой мэт ахапіць увесь спектар праблем. Між тым краязнаўчы рух у 1920–1930-х гг. як адметная гістарычная і сацыяльна-культурная з'ява патрабуе комплекснага, грунтоўнага аналізу.

### Літаратура


1. Акиньшин А. Н. Судьба краеведов // Вопросы истории. – М., 1992. – № 6–7.
2. Алексеев А. В. Археология и краеведение в Белоруссии. XVI – 30-е гг. XX ст. – Мн., 1996.
3. Амелькович Л. Г. Деятельность центрального бюро краеведения Белоруссии (1923–1933 гг.) // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. – Мн., 1975.
4. Бандарчык В. Г. Гісторыя Беларускай Савецкай этнаграфіі. – Мн., 1972.
5. Вяргей В. С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР 1919–1941 гг. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992.
6. Дмитриева И. А. Краеведение после октябрьской революции // Вести МЭН. – М., 1999. – № 4.
7. Загарульскі Э. М. Краязнаўства ўчора і сёння // Спадчына. – 1989. – № 2. – С. 11–13.
8. Інстытут Беларускай культуры. – Мн., 1993.
9. Историческое краеведение Белоруссии. – Мн., 1980.
10. Кабанов П. И., Ушаков А. В. О советском историческом краеведении // История СССР. – М.: Изд-во Академии наук, 1963. – № 3. – С. 3–47.
11. Ліндпэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыянальны працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX стст. – СПб., 2003. – С. 195.
12. Разгон А. М. Пути советского краеведения // История СССР. – М.: Изд-во Академии наук, 1967. – № 4.
13. Романова И. Местечко Советской Беларуси во второй половине 1920-х.: по материалам журнала «Наш край» // Sytetł – wspolne dziedztwo. – Białystok, 2003.
14. Рюмина Т. С. Историческое краеведение в Москве в 1920–1930-х гг.: Автореф. дис. ...канд. – М., 1995.
15. Соркіна І. Праблемы мястэчак Беларусі на старонках часопіса «Наш край» (другая палова 20-х гадоў) // Гістарычны альманах. – Гародня, 2004. – Т. 10.
16. Тихоновский С. Л. Состояние и задачи дальнейшего развития исторического краеведения в СССР // Вопросы истории. – 1988. – № 1. – С. 24–31.
17. Улашчык М. М. Краязнаўства. – Мн.: Бел НДІДАС-Пейро, 1999. – С. 160.
18. Филимонов С. Б. Краеведческие организации Европейской России и документальные памятники. – М., 1991.
19. Юньев И. С. Возродить массовое краеведческое движение // История СССР. – 1960. – № 3.